АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

# Агульны рынак у СССР?

**У мінулыя суботу і нядзелю ў Таліне адбылася рабочая нарада кіраўнікоў урадаў Літвы, Латвіі, Эстоніі, прадстаўнікоў урадаў Беларусі, Малдовы, Расіі, Массавета, Ленсавета, Ленаблсавета. На ёй зроблены першы крок да стварэння балтыйскага і — далей — новага саюзнага рынка, абмяркоўвалася сістэма прамых міжрэгіянальных сувязей, развіцця і ўмацавання эканамічнай інтэграцыі.**

**Прадстаўнік Беларусі на гэтай сустрэчы, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Міхаіл Уладзіміравіч МЯСНІКОВІЧ дзеліцца з карэспандэнтам «Звязды» сваімі ўражаннямі аб сустрэчы.**

**— Міхаіл Уладзіміравіч, у прыбалтыйскай прэсе прамільгнула думка аб тым, што 5—6 жніўня ў Таліне закладваўся падмурак новага Саюза, які павінен стаць тым самым, што і Агульны рынак.**

— Я б не хацеў, каб гэтай сустрэчы нехта надаваў палітычнае адценне. Гэта была перш за ўсё эканамічная нарада. Мы ехалі ў Талін па запрашэнню кіраўніка эстонскага ўрада Эдгара Савісаара з надзеямі аб наладжванні добрых партнёрскіх міжрэспубліканскіх эканамічных сувязей. Прадстаўніцтва там было аўтарытэтнае і сур'ёзнае. Работа ішла — я не перабольшваю — практычна двое сутак. Я вельмі задаволены тым, што ў многім мы сышліся ў пунктах погляду на эканамічнае супрацоўніцтва раўнапраўных суверэнных партнёраў. І не толькі канцэптуальна, але і ў многіх канкрэтных момантах.

Прынцыповых супярэчнасцей у нас выяўлена не было. Падтрымана прапанова нашай дэлегацыі аб тым, што ў супрацоўніцтве неабходна вылучыць некалькі ўзроўняў. Напрыклад, на ўзроўні ўрадаў рэспублік заключаецца пагадненне, дзе вызначаюцца асноўныя моманты ў падыходах да эканамічнага, навукова-тэхнічнага, культурнага супрацоўніцтва, намячаецца, як мы гаворым у такіх сітуацыях, пажарная наменклатура — тавары ці прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння, без якой

***З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі***